# Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР

# К. В. Кісялёва

## на пленарным пасяджэнні XIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню аб раззбраенні 4 лістапада 1958 года

Пан старшыня,
панове дэлегаты,

беларуская дэлегацыя таксама жадае выкласці свой пункт гледжання па абмяркоўваемых намі праектах рэзалюцый па пытанню аб раззбраенні. Як вядома, у агульных дэбатах на пленуме Генеральнай *Асамблеі выступілі* прадстаўнікі 72 краін з 81 дзяржавы—членаў ААН. Дэлегаты, якія прынялі ўдзел у агульных дэбатах, гаварылі галоўным чынам па пытанню аб раззбраенні. І гэта зразумела, бо гэтае пытанне з'яўляецца *асноўным пытаннем нашага парадку дня*. *Пытанне аб раззбраенні* намі актыўна абмяркоўвалася і ў Палітычным камітэце. Гэта гаворыць аб тым, што пытанне аб раззбраенні прызнаецца найбольш сур'ёзнай праблемай пасляваеннага часу. Пад агульнай назвай пытання *аб раззбраенні мы фактычна абмяркоўвалі тры пытанні: аб спыненні выпрабаванняў* атамнай і вадароднай зброі, аб скарачэнні ваенных бюджэтаў і аб скарачэнні звычайных узбраенняў і ўзброеных сіл.

выпрабаванняў ядзернай зброі. З-за выкладзеных прычын наша дэлегацыя будзе галасаваць супраць *гэтай рэзалюцыі.*

Што датычыць рэзалюцыі, прапанаванай дэлегацыямі Японіі, Швецыі і Аўстрыі, то наша дэлегацыя лічыць гэтую рэзалюцыю зусім нездавальняючай. У ёй перш за ўсё не паказана імкненне народаў, патрабуючых неадкладнага і паўсюднага спынення на вечныя часы выпрабаванняў атамнай і вадароднай *зброі. Гэтая рэзалюцыя* абходзіць маўчаннем заклік большасці *краін—членаў* ААН да спынення выпрабаванняў *ядзернай* зброі.

Беларуская дэлегацыя не зможа падтрымаць рэзалюцыі, за якія маглі б галасаваць ЗША і Англія, якія ўсяляк перашкаджаюць спыненню выпрабаванняў ядзернай зброі. Генеральная *Асамблея не* мае права *знімаць з сябе* адказнасць і павінна выказацца *ясна* і недвухсэнсава ў падтрымку прапановы аб неадкладным і безумоўным спыненні ЗША, Англіяй і СССР выпрабаванняў ядзернай зброі. Спыненне

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы